УДК 792:303.446.4(476)

# НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ТЭАТРА

***А. В. Пагоцкая,*** *кандыдат мастацтвазнаўства, дэкан факультэта мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны аналізу вывучэння гістарыяграфіі гісторыі беларускага тэатра. Разглядаюцца перадумовы вывучэння гісторыі тэатральнага мастацтва, асноўныя этапы развіцця гісторыі беларускага тэатра, а таксама яго відавая разнастайнасць. Аналізуецца роля дзеячаў культуры і мастацтва, якія паўплывалі на развіццё беларускага тэатра. Зроблены высновы аб неабходнасці даследавання новых форм тэатра, фіксацыі самых актуальных з'яў беларускай тэатральнай культуры ў кантэксце сусветнага мастацтва.

**Ключавыя словы:** аналіз, гісторыя, гістарыяграфія, даследаванне, тэатральнае мастацтва, тэатразнаўства.

# SOME QUESTIONS OF STUDYING THE HISTORIOGRAPHY OF THE HISTORY OF THE THEATER OF BELARUS

***E. Pahotskaya,*** *Candidate of Art History, Dean of the Faculty of Artistic Culture of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article is devoted to the analysis of the study of the historiography of the history of the Belarusian theater. The article examines the prerequisites for studying the history of theater art, the main stages of development of the history of the Belarusian theater, as well as its species diversity. The author analyzes the role of cultural and artistic figures who influenced the development of Belarusian theater, draws conclusions about the necessity of researching new forms of theater, recording the most relevant phenomena of Belarusian theater culture in the context of world art.

**Keywords:** analysis, history, historiography, research, theater art, theater studies.

Беларускі тэатр прайшоў шматвекавую гісторыю развіцця. Даследчыкам даўно вядомыя вытокі тэатральнай дзейнасці: старажытныя народныя святы, абрады, рытуальныя дзеянні, гульні. Гісторыя беларускага тэатральнага мастацтва здаўна цікавіла практыкаў і тэарэтыкаў тэатра. А працэс сістэматычнага гістарычнага даследавання наладзіўся толькі ў XX ст.

Адной з прычын гэтага можна назваць тое, што беларускія землі на працягу стагоддзяў з'яўляліся часткай Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы

Паспалітай, таму многія даследаванні разглядаюць беларускі тэатр як частку польскай і літоўскай культуры. Важныя матэрыялы па гісторыі тэатральнага мастацтва і архітэктуры ўтрымліваюцца ў даследаваннях польскіх навукоўцаў С. Беднарскага, Т. Бранеўскага, Б. Круль-Качароўскай, А. Цеханавецкага, А. Сайкоўскага [6, с. 6].

Першыя спробы тэарэтычна асэнсаваць тэатральныя працэсы былі зроблены ў XVII ст. М. К. Сарбеўскім, які ў трактаце «Пра трагедыю і камедыю, або Сенэка і Тэрэнцый» падрабязна апісаў сцэнічную тэхніку, машыны, абсталяванне, тэарэтычна абгрунтаваў паэтыку і даў практычныя парады да пастановак школьнага тэатра. Пазней элементы сцэнаграфіі школьнага тэатра выкарысталі ўсе плыні тэатральнага мастацтва – ад класіцызму і псіхалагічнага рэалізму да мадэрнізму і «тэатра абсурду» [4, с. 6].

Для даследавання гістарыяграфіі беларускага тэатра важную ролю мае дзейнасць вядомых беларускіх тэатралаў. Напрыклад, у рабоце навукоўца А. Мілера «Польскі тэатр і музыка ў Літве» разглядаецца ўнёсак у тэатральную культуру такіх асоб, як М. К. Радзівіл, М. К. Агінскі, А. Тызенгаўз, А. Сапега, якія ўтрымлівалі свае тэатры і забяспечвалі іх творчае існаванне. Асобае месца ў даследаванні адводзіцца дзейнасці княгіні Ф. У. Радзівіл, якая стварыла першы драматычны тэатр на землях Беларусі. А. Мілер падкрэслівае сувязь многіх п’ес княгіні з традыцыямі музычнага тэатра Заходняй Еўропы: італьянскай операй і пастаральнай драмай [10].

У другой палове XX ст. вывучэнне гісторыі беларускага тэатра з боку польскіх вучоных працягваецца. Шырокі агляд сядзібнай архітэктуры Беларусі, якая не поўнасцю захавалася да нашага часу, асаблівасці драматургіі XVIII ст. змешчаны ў зборах даследчыкаў і гісторыкаў Ю. Кжыжаноўскага, К. Вяжбіцкай, Р. Афтаназі [6, с. 6].

Беларускае тэатразнаўства ўнесла грунтоўны ўклад у вывучэнне гісторыі нацыянальнага тэатра ад яго вытокаў да сучаснай практыкі. Прафесійны падыход да вывучэння тэатральнага мастацтва Беларусі назіраецца толькі ў XX ст. Але ўжо ў публікацыях канца XIX ст., звязаных з жыццём асобных гарадоў, зафіксаваны гістарычныя факты тэатральнага жыцця: звесткі пра тэатральныя будынкі, побыт акцёраў, напрыклад, Мінска («Мінскі тэатр і яго мінулае» А. Смародскага ў «Памятнай кніжцы Мінскай губерніі на 1891 г.»), Віцебска («Старонкі з нядаўняй старажытнасці горада Віцебска» М. Нікіфароўскага, 1899), Гродна («Нарыс гісторыі горада Гродна» Я. Арлоўскага, 1899) і г. д. [2, с. 183]. Вялікае значэнне для вывучэння гісторыі беларускага тэатра маюць запісы яго народных форм, зробленыя фалькларыстамі ў XIX ст. Яны змяшчаюць аналіз тэкстаў беларускіх інтэрмедый і народнай драмы: мы знаходзім звесткі ў працах Е. Раманава і А. Брукнера. Пра батлейку і школьны тэатр пісалі П. Бяссонаў і К. Харламповіч. Найбольш поўную карціну развіцця народнага тэатра даў Я. Карскі [2, с. 7].

Першыя спробы паставіць справу вывучэння гісторыі беларускага тэатра на навуковыя асновы былі зроблены ў гады дзейнасці Інстытута беларускай культуры (1922–1929), на базе якога затым была створана Акадэмія навук. У 1924 г. беларускі драматург Ф. Аляхновіч стварыў манаграфію «Беларускі тэатр», дзе паслядоўна прааналізаваў фальклорныя вытокі тэатральнага мастацтва, батлейку, народную драму з яе інтэрмедыямі, высока ацаніў творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча, І. Буйніцкага, Янкі Купалы і інш. Адным з сур'ёзных даследаванняў стала кніга Я. Рамановіча «Першы тэатр» (1946), у якой сцісла, але аргументавана разглядаецца шлях старэйшага беларускага нацыянальнага тэатра [2, с. 7].

Сістэматычнае вывучэнне гісторыі, тэорыі і сучаснага стану тэатральнага мастацтва пачалося толькі ў 1957 г. разам з арганізацыяй у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сектара тэатра і кіно (з 1995 г. – аддзел тэатральнага мастацтва), прыярытэтным напрамкам якога стала вывучэнне гісторыі беларускага тэатра, драматургіі і творчасці дзеячоў сцэны.

У вывучэнні гісторыі прафесійнага тэатра Беларусі, мастацка-матэрыяльнай культуры Беларусі і непасрэдна сцэнаграфіі беларускіх тэатраў вялікае значэнне належыць доктару мастацтвазнаўства, прафесару Г. Барышаву. Ён з'яўляецца стваральнікам аднаго з буйнейшых даследаванняў тэатра Беларусі «Тэатральная культура Беларусі XVIII ст.», дзе падрабязна аналізуюцца асноўныя формы тэатральнага мастацтва названага перыяду. Г. Барышаў прасочвае шляхі развіцця розных тыпаў школьнага, прыдворнага прыватнаўласніцкага і буржуазна-камерцыйнага тэатраў, а таксама народнай тэатральнай творчасці [1].

З пункту гледжання гісторыі тэатральнага мастацтва важнай працай стала выданне трохтомніка «Гісторыя беларускага тэатра» [2]. Калектыў аўтараў пад рэдакцыяй У. Няфёда, Г. Барышава, А. Сабалеўскага і інш. стварыў грандыёзную працу, у якой утрымліваюцца звесткі пра народны, школьны, прыватнаўласніцкі тэатр, а таксама драматургію, рэпертуар, рэжысуру XIX–XX стст. Сабраны багаты матэрыял, абмежаваны апошняй трэццю XX ст., а новы факталагічны матэрыял і гістарычныя звесткі патрабуюць далейшага даследавання, абапіраючыся на сучасныя навуковыя падыходы і новыя метадалогіі.

Нарэшце, важнай крыніцай інфармацыі для дадзенага даследавання стала энцыклапедыя «Тэатральная Беларусь», выдадзеная пад агульнай рэдакцыяй доктара мастацтвазнаўства, прафесара А. Сабалеўскага, дзе ўпершыню сістэматызавана разглядаецца тэатральнае мастацтва Беларусі, змешчаны шырокі факталагічны матэрыял і мноства ілюстрацый, звесткі пра асобныя тэатры [8].

Здаецца, што ў гісторыі беларускага тэатра не засталося белых плям, але даследаванні працягваюцца і ў XXI ст. Навукоўцы, гісторыкі, мастацтвазнаўцы паглыбляюцца ў праблемнае поле гісторыі беларускага

тэатра. Сучасныя даследчыкі вывучаюць, напрыклад, асаблівасці з'яўлення тэатральных прымітываў на землях Вялікага Княства Літоўскага [5], асаблівасці існавання мастацкіх стыляў (напрыклад, барока і ракако) у Беларусі і прынцыпы тэатральнасці як асноўны фактар узаемасувязі ўсіх элементаў структуры барока, умовы сінтэзу ўсіх відаў мастацтва [3] і інш. У першым дзесяцігоддзі XXI ст. з'явіліся комплексныя мастацтвазнаўчыя працы, прысвечаныя даследаванню тэатральнай прасторы, гледача, сцэнаграфіі беларускіх тэатраў: работы Р. Смольскага [7], В. Ярмалінскай [9] і інш. Даследчыкі характарызуюць галоўныя тэндэнцыі развіцця тэатральнага мастацтва ў драматычным тэатры, а таксама ўзнімаюць шэраг важных творча-арганізацыйных пытанняў, сярод якіх патрабаванне змястоўнага і высакаякаснага рэпертуару, стварэнне нацыянальнага прафесійнага тэатра, выхаванне нацыянальных акцёрскіх кадраў і г. д.


1. *Барышев, Г. И.* Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г. И. Барышев. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 293 с.

2. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983–1987. – Т. 1 : Беларускі тэатр ад вытокаў да Кастрычніка 1917 г. / М. Каладзінскі [і інш.] ; рэдкал.: У. І. Няфёд (гал. рэд.) [і інш.] ; рэд. т. Г. І. Барышаў, А. В. Сабалеўскі. – 1983. – 496 с.

3. *Катовіч, Т. В.* Тэатральнасць эпохі барока / Т. В. Катовіч // Мастацтва. – 1997. – № 3. – С. 55–56.

4. *Конан, У.* Полацкі курс паэтыкі М. К. Сарбеўскага (1618–1627 гг.) / У. Конан // Весці Акадэміі навук Беларус. ССР. – 1972. – № 1. – С. 114–122.

5. *Корсакова, Е. Е.* Художественный примитив в пластическом и театральном искусстве Беларуси XVI–XVIII вв. / Е. Е. Корсакова. – Минск : А. Н. Вараксин, 2018. – 182 с.

6. *Пагоцкая, А. В.* Мастацка-стылявая эвалюцыя сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў у Беларусі канца XVI – пачатку XX стагоддзя : аўтарэф. дыс. ... канд. мастацтвазнаўства : 17.00.09 / А. В. Пагоцкая ; [навук. кір. А. Я. Корсакава]. – Мінск : [б. в.], 2019. – 25 с.

7. *Смольскі, Р. Б.* Рэха мінулага: тэатразнаўчыя эцюды аб беларускай культуры XX стагоддзя / Р. Б. Смольскі. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – 272 с.

8. Тэатральная Беларусь : энцыкл. : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2002.

9. *Ярмалінская, В. М.* Сцэнаграфія Беларусі XX – пачатку XXI ст. / В. М. Ярмалінская. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 221 с.

10. *Miller, A.* Teatr polski I muzyka na Litwie jako strażnice kultury zachodu (1745–1865) / A. Miller. – Wilno : Studjum zdziejów kultury polskiej, 1936. – 225 s.